# Мая Радзіма – Беларусь

Жучкоў Арцём, вучань 6 “А” класа
ДУА “Гімназія № 37 г. Мінска”

Беларусь – гэта мая Радзіма назаўсёды. Яна, як маці, грэе і аберагае мяне, што б не здарылася. Сваёй прагажосцю заўсёды вабіць мяне, і не толькі мяне, усіх. Яе залатыя палі, якія на сонцы блішчаць ліхтарыкамі, лясы з магутнымі і разнастайнымі дрэвамі, на якія так і хочацца хоць адзін раз паглядзець. Ручаі, якія пачынаюць напяваць свае песні пасля таго, як растане снег. Хіба гэта не захапляльна, разгледзець прыгажосць нашай краіны?

А Беларусь вясной… Якая яна цудоўная! Як упрыгожвае яе прырода! Вы толькі паглядзіце, як вясною на дрэвах распускаюцца пупышкі, надаючы ім выгляд маладых дзяўчат з рознымі прычоскамі. А калі на дрэвах яшчэ распускаюцца кветкі, тады прычоскі становяцца больш разнастайнымі. І кожнае дрэўца прыгожае па-свойму. Але кветкі з’яўляюцца не толькі на дрэўцах.

Яны дружнымі групкамі квітнеюць у садах, парках і клумбах. Гэтыя кветкі надзяляюць нашу краіну святлом, нават у пахмурныя дзянькі.

А што ж яшчэ можа ўпрыгожваць нашу краіну  як не палі, засаджаныя рознымі культурамі: жытам, аўсом, пшаніцай, кукурузай і іншымі. А калі на полі квітнее рапс… Тады душа пачынае спяваць ад убачанага цуду!

Ну а калі паглядзіш на лес, ён запрашае цябе ў глыбіню, каб ты заўважыў лясныя таямніцы і жывёл, асабліва зубра. Нездарма зубр – гэта сімвал Рэспублікі Беларусь, таму што ён магутны, вялікі і заўсёды абараняе сваю сям’ю.

Яшчэ ў лясах Беларусі можна нацешыцца спевам птушак. Іх галасы разлятаюцца па ўсёй краіне, ад таго і лёгка на душы…

Песні… Яны розныя на нашай зямлі. Больш за ўсё іх можна пачуць на святы. Як я люблю беларускія святы! Кожнае свята адметнае па-свойму. А якія карагоды заводзіць народ у ноч на Купалле! Дзяўчаты плятуць вянкі, спяваюць песні і ідуць шукаць Папараць-кветку. А ёсць яшчэ і легенда, што той, хто Папараць-кветку знойдзе – шчаслівым назаўсёды зробіцца. Але шчасце ў кожнага з нас ужо ёсць. Мы шчаслівыя тым, што жывём ў гэтай краіне!

У нас ёсць яшчэ шмат такіх святаў. Масленіца, на якую ўсе пякуць бліны па розных рэцэптах. І якія начынні кладуць  у бліны… Смаката…

А якая ж наша краіна без добразычлівага і працавітага народа? Наша Радзіма кожны дзень развіваецца. За кошт таго, што людзі не пакладаючы рук імкнуцца знайсці нешта новае і ўнесці ўклад у развіццё Беларусі.

А як можна гаварыць пра Беларусь, не згадаўшы пра будынкі неверагоднай вышыні. Вось паглядзі, Нацыянальная бібліятэка ўзвышаецца на 73 метры. Вы толькі ўявіце, якія віды можна ўбачыць з яе вяршыні. А паглядзі на Мінск-Арэну. Яна змяшчае ў сабе больш за пятнаццаць тысяч чалавек!

Давайце заглянем і ў іншыя куточкі нашай краіны. Вось у Брэсце вы можаце ўбачыць Брэсцскую крэпасць. Яна нагадвае часы вайны… Аж да мурашак. А яшчэ помнік гэтай жудаснай трагедыі – вёска Хатынь.

Гавораць, Беларусь – сінявокая, белакрылая. А белакрылая ад таго, што буслы яе абараняюць сваімі крыламі. Але немагчыма перадаць усю прыгажосць нашага роднага краю. Лепш паглядзіце сваімі вачыма.

Беларусь – наша і назаўсёды!

Закончыць хочацца ўласнымі вершаванымі радкамі, якія я прысвячаю сваёй Радзіме.

Мая краіна- Беларусь
Ты паглядзі, ах, як прыгожа
Мая краіна- Беларусь.
Мая Радзіма, мой куточак
І я Ёй вельмі ганаруся.

Вось гэта маці мая,
Вось гэта край мой родны.
І расказаць я вам хачу
Пра прыгажосць яе прыроды.

Пра лес, і рэчкі, і палі
І пра маленькія куткі
Куды так хочацца вяртацца.
Вось гэта Беларусь мая!

Ніколі не забуду,
Як было мне міла,
Калі з бацькамі ўздоўж ракі
Я пагуляць хадзіла.

Брэсцкая крэпасць,
Нясвіжскі палац,
Дом афіцэраў,
Усё гэта для нас!

Мастацкі музей,
Сафійскі сабор,
Тут цікавага шмат,
Запрашаем сяброў.

А колькі там звяроў жыве!?
Злічыць усіх, жыцця не хопіць.
Галоўны самы -гэта зубр,
У Белавежскай пушчы ходзіць.

У маёй краіне шмат прыгожых
Блакітных рэчак і азёр,
Лугоў бязмежных і вялікіх,
Зялёных, казачных лясоў.

Ты толькі паглядзі
На гэтыя прыгажосці!
Усіх мы запрашаем
У краіну нашу ў госці!

Мы дзякуй скажам гучна тым,
Хто ў далёкія гады
Абараняў маю краіну!
Каб жылі ў шчасці, я і ты!

Мы дзякуй скажам тым героям,
Хто даў магчымасць у міры жыць,
Каб былі шчаслівымі мы з табою,
Маглі і верыць, і любіць!